раёнаў. Выключэнне — некаторыя гарады абласнога падпарадкавання (Жодзіна і Наваполацк), якія з'яўляюцца буйнымі прамысловымі цэнтрамі, але не з'яўляюцца адміністрацыйнымі цэнтрамі раёнаў.

**Падвядзём вынікі.** Эканоміка Беларусі мае развітую галіновую і тэрытарыяльную структуру. ВУП краіны — 246,6 млрд руб., ВУП на душу насельніцтва — 27,0 тыс. руб. Гаспадарка Беларусі падзяляецца на сферу вытворчасці і сферу паслуг, з перавагай апошняй у структуры ВУП. Размяшчэнне галін гаспадаркі залежыць ад прыродна-рэсурснага патэнцыялу, эканоміка-геаграфічнага становішча, працоўных рэсурсаў, спажывецкага, экалагічнага, транспартнага, інфармацыйнага і іншых фактараў.

***Праверце сябе.*** 1. Як змяняецца ВУП краіны на сучасным этапе развіцця эканомікі? 2. Назавіце мадэль развіцця эканомікі Беларусі. 3. На якія сферы падзяляецца эканоміка Беларусі? 4. Якія ўмовы і фактары ўплываюць на размяшчэнне вытворчасці ў Беларусі? 5. Які прамысловы цэнтр адносіцца да найбуйнейшых па аб'ёмах вытворчасці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Пералічыце віды прамысловай прадукцыі, вытворчасць якой залежыць ад сыравіннага і паліўна-энергетычнага фактараў. 2. Растлумачце, якія галіны гаспадаркі арыентуюцца на спажыўца і чаму.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па дадзеных атласа і інтэрнэт-рэсурсаў падрыхтуйце паведамленне пра структуру валавога рэгіянальнага прадукту вашай вобласці.

## § 27. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Геаграфія раслінаводства

***Успомніце.*** *На якія падгаліны падзяляецца сельская гаспадарка? У чым асаблівасці агракліматычных рэсурсаў Беларусі?*

**1. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Сельская гаспадарка з'яўляецца важнай галіной эканомікі Рэспублікі Беларусь, якая забяспечвае харчовую бяспеку краіны. Асноўная задача сельскай гаспадаркі — задавальненне попыту насельніцтва на прадукты харчавання, а таксама забеспячэнне сыравінай прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці. Сельскагаспадарчая вытворчасць — асноўны від занятасці ў сельскай мясцовасці. На долю сельскай гаспадаркі ў Беларусі прыпадае 6,1 % ВУП, у ёй занята 7 % у спісачнай колькасці занятых у эканоміцы. Спецыялізуецца сельская гаспадарка на вытворчасці малака і мяса, збожжавых культур, бульбы, цукровых буракоў і лёну. Па аб'ёме вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі вылучаюцца Мінская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Беларусь амаль цалкам забяспечвае сябе харчаваннем. У 2023 г. узровень самазабеспячэння малаком склаў каля 283 %, мясам — 135 %, яйкамі — 123 %, бульбай — 111 %, гароднінай — 103 %. Беларусь уваходзіць у пяцёрку краін свету — лідараў па валавым зборы жыта і трыцікале, у дзясятку краін — па зборы журавін, грэчкі. Імпарт складае менш за 10 % усяго аб'ёму спажывання.

Сельская гаспадарка падзяляецца на раслінаводства і жывёлагадоўлю. У вартасным выражэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 2023 г. доля жывёлагадоўлі склала 53 %, а раслінаводства — 47 %.

Асноўная роля ў структуры сельскай гаспадаркі належыць сельскагаспадарчым арганізацыям, на долю якіх прыпадае амаль 80 % вытворчасці прадукцыі. Да іх адносяцца агракамбінаты, сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы, камунальныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і інш. Найбуйнейшымі з іх з'яўляюцца «Сервалюкс-Агра» (Смалявіцкі і Магілёўскі раёны), «Дзяржынскі» (Дзяржынскі раён), «Сноў» (Нясвіжскі раён), «Скідзельскі» (Гродзенскі раён). У краіне ствараюцца аграхолдынгі, якія ўключаюць вытворчасць, перапрацоўку і рэалізацыю сельгаспрадукцыі («Галерэя Смаку» ў Маладзечанскім раёне, «Славянскі Велес» у Віцебскім раёне).

Назіраецца ўстойлівы рост колькасці сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і іх удзельнай вагі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У 2023 г. у краіне зарэгістравана больш за 3000 фермерскіх гаспадарак, якія выпрацоўваюць каля 3 % сельскагаспадарчай прадукцыі.

Удзельная вага асабістых падсобных гаспадарак у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 2023 г. — каля 19 %. Пры гэтым сярод уладальнікаў такіх гаспадарак вялікая доля гараджан, якія маюць дачныя ўчасткі.

**2. Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў.** Плошча сельскагаспадарчых зямель у Беларусі складае 8,1 млн га (40 % усяго зямельнага фонду краіны). У залежнасці ад прыродных умоў, асвоенасці тэрыторыі і іншых фактараў фарміруецца структура сельскагаспадарчых угоддзяў. Яна можа значна адрозніваецца па абласцях і раёнах Беларусі. У цэлым па краіне пераважаюць ворныя землі, на долю якіх прыпадае 69 % плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў. Лугі і пашы займаюць 30 %, пастаянныя культуры — 1 %.

Па карце атласа (с. 40) вызначце адрозненне структуры сельскагаспадарчых угоддзяў па абласцях.

**3. Геаграфія раслінаводства.** У раслінаводстве Беларусі найбольшае значэнне мае збожжавая гаспадарка. Ад колькасці і якасці збожжа залежыць не толькі забеспячэнне насельніцтва харчовымі хлебнымі прадуктамі, але і вытворчасць канцэнтраваных кармоў для жывёлагадоўлі.

Збожжавыя культуры вырошчваюцца ва ўсіх раёнах Беларусі і займаюць каля 44 % ворных зямель, у цэнтральных і заходніх раёнах доля збожжавых вышэйшая. Плошча пасеваў азімых на 20 % большая за плошчу пасеваў яравых. Сярод збожжавых культур найбольш распаўсюджана азімая і яравая пшаніца (каля 30 %). Значныя пасевы трыцікале (19 %), ячменю (18 %) і жыта (15 %). На долю пшаніцы, трыцікале і ячменю прыпадае каля 70 % валавога збору збожжавых. Найбольшыя плошчы пасеваў збожжавых культур характэрныя для Мінскай вобласці.

Ад чаго залежыць змяненне долі пасеву збожжавых культур па краіне?

Па карце атласа (с. 41) вызначце вобласці (раёны), якія вылучаюцца па валавым зборы і ўраджайнасці збожжавых культур.

Самая каштоўная харчовая культура — пшаніца (мал. 90). Па плошчы пасеваў нязначна пераважае яравая пшаніца. У апошнія гады павяліčыліся пасевы трыцікале, або пшанічна-жытняга гібрыда, які выкарыстоўваецца як харчовая і фуражная культура.

1. Пшаніца — патрабавальная да цяпла, вільгаці, урадлівасці глебы



2. Трыцікале — валодае марозаўстойлівасцю, устойлівасцю да грыбковых і вірусных хвароб, нізкай патрабавальнасцю да ўрадлівасці глебы



3. Жыта — лёгка пераносіць неспрыяльнае надвор'е, нізкую ўрадлівасць глебы і яе кіслотнасць



4. Ячмень — патрабавальны да высокай урадлівасці глебы



5. Авёс — патрабавальны да вільготнасці і прахалоды, высейваецца раней за іншыя яравыя збожжавыя культуры



6. Кукуруза — патрабавальная да асветленасці, цяпла, урадлівасці глебы



7. Грэчка — патрабавальная да цяпла і вільготнасці



Мал. 90. Збожжавыя культуры, якія вырошчваюцца на тэрыторыі Беларусі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жыта — найбольш устойлівая да прыродных умоў Беларусі культура. Асноўныя яе пасевы размяшчаюцца на поўдні краіны. Ячмень — адна з самых хуткаспелых культур, мае выдатныя кармавыя якасці. Найбольшыя плошчы ячмень займае ў цэнтральнай і заходняй частках Беларусі.

Авёс вырошчваецца паўсюдна, але канцэнтрацыя пасеваў большая на поўначы краіны. На поўдні Беларусі пашырыліся пасевы кукурузы на зерне. На паўднёвым усходзе традыцыйнай культурай працяглы час была грэчка. Яшчэ на пачатку XX ст. па плошчы пасеваў яна саступала толькі жыту. Але пасевы грэчкі скарачаюцца з-за моцнага назапашвання ў яе зерні радыенуклідаў і невялікага павелічэння ўраджайнасці.

Бульбаводства — адна з падгалін спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі (мал. 91).

Лёгкія па гранулametрычным складзе глебы, аптымальны цеплавы і водны рэжым тэрыторыі, шырокае выкарыстанне бульбы ў якасці прадукту харчавання насельніцтва і корму для свіней спрыялі яго распаўсюджанню ў краіне. У рэгіянальнай структуры пасяўных плошчаў і валавога збору бульбы вылучаецца Мінская вобласць. Па ўраджайнасці бульбы лідзіруе Гродзенская вобласць.

По зборы бульбы ў разліку на аднаго жыхара Беларусь займае адно з першых месцаў у свеце (каля 500 кг). Краіна штогод дае 3–4 % сусветнага збору гэтай культуры, цалкам забяспечвае свае патрэбы і значную колькасць экспартуе.

Агародніцтва развіваецца пераважна ў прыгарадных зонах Мінска і абласных цэнтраў, а таксама ў раёнах размяшчэння буйных агароднінаперапрацоўчых прадпрыемстваў (Быхаўскім, Маларыцкім раёнах і інш.). Буйныя прадпрыемствы па вырошчванні гародніны: агракамбінат «Ждановічы», Мінскі парнікова-цяплічны камбінат і інш. Атрымала развіццё прамысловае вырошчванне грыбоў (шампіньёнаў, вешанак і інш.). Буйны камбінат па вырошчванні грыбоў — «Зялёны бор» у Баранавічах. Асаблівасць вырошчвання бульбы, гародніны, грыбоў у тым, што асноўныя іх зборы прыпадаюць на асабістыя падсобныя і фермерскія гаспадаркі.

| Бульба — універсальная культура, якая выкарыстоўваецца | | | |
|---|---|---|---|
| у харчаванні людзей | у кармленні жывёлы | як сыравіна для прамысловасці |  |

Мал. 91. Выкарыстанне бульбы

Найбольш спрыяльныя ўмовы для садоўніцтва ёсць у паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельскай вобласці. Самыя буйныя масівы садоў размешчаны ў Брэсцкай («Агра-сад Расвет»), Мінскай («Зубкі») і Магілёўскай («Дусен») абласцях.

Для таго каб пазнаёміць вучняў з аграрнай прафесіяй, тэхналогіяй вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, за ўстановамі адукацыі замацаваны сады і ўчасткі гародніны сельскагаспадарчых арганізацый. Многія школы і гімназіі маюць вучэбна-доследныя ўчасткі, дзе вучні вырошчваюць гародніну, даглядаюць пладовыя дрэвы.

Новы від бізнесу для Беларусі — прамысловае вырошчванне ягад: буякоў, клубніц, парэчак, малін, кавуноў. Значная колькасць ягад вырошчваецца фермерскімі гаспадаркамі («Альшаны» ў Стаўбцоўскім раёне, «Ягадныя рэкі» ў Гомельскім раёне).

Беларусь размяшчаецца ва ўмераных шыротах і пакуль не ў стане цалкам забяспечыць сябе пладамі, таму частка іх завозіцца з Малдовы, Узбекістана, Азербайджана.

Тэхнічныя культуры ў Беларусі, у параўнанні са збожжавымі, займаюць невялікія плошчы, аднак іх пасевы за апошнія гады павялічваюцца. Вырошчваецца ўсяго некалькі культур, сярод якіх найбольш традыцыйная — лён-даўгунец (мал. 92). Найбольшая канцэнтрацыя лёну — у Віцебскай вобласці, на поўначы Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, у якіх ільнаводства з'яўляецца падгаліной спецыялізацыі.

Як на вырошчванне лёну ў Беларусі ўплывае змяненне клімату?

У краіне засяроджана каля 20 % сусветных пасеваў лёну. Беларусь займае трэцяе месца ў свеце па вытворчасці льновалакна.

Лён-даўгунец — спрыяльныя прахалоднае і вільготнае лета з вялікай колькасцю пахмурных дзён, суглінкавыя і супясчаныя глебы



Цукровыя буракі — патрабуюць шмат сонечнай энергіі, вільгаці, урадлівых глеб



Рапс — патрабавальная да вільгаці і ўрадлівасці глебы, холадаўстойлівая культура



Мал. 92. Тэхнічныя культуры, якія вырошчваюцца на тэрыторыі Беларусі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Важнае значэнне ў Беларусі маюць цукровыя буракі. Іх пасевы сканцэнтраваныя ў асноўным у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. У параўнанні з 2000 г. валавы збор цукровых буракоў павялічыўся ў 4 разы. Адной з галоўных тэхнічных культур у Беларусі ў апошнія гады стаў рапс, з семя якога атрымліваюць алей (мал. 92). Найбольшая плошча пасеваў рапсу характэрная для Мінскай вобласці.

**4. Вырошчванне кармавых культур.** У краіне доля кармавых культур у палявым севазвароце пастаянна павялічваецца. У Віцебскай і Магілёўскай абласцях кармавыя культуры займаюць 40 % пасеваў. У Віцебскай вобласці пераважае чырвоная і ружовая канюшына. На Палессі распаўсюджаны лубін і цімафееўка, на паўночным захадзе, захадзе і поўдні — пасевы кукурузы на сілас.

**Падвядзём вынікі.** У структуры сельскагаспадарчых зямель пераважаюць ворныя — 69 %. Самыя распаўсюджаныя збожжавыя культуры: пшаніца, трыцікале, ячмень і жыта. Важнымі тэхнічнымі культурамі з'яўляюцца лён-даўгунец, цукровыя буракі і рапс. Бульбаводства — падгаліна спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

***Праверце сябе.*** 1. Якую ролю адыгрывае сельская гаспадарка ў эканоміцы краіны? 2. Якія збожжавыя культуры вырошчваюць у краіне? 3. Назавіце тэхнічныя культуры, якія вырошчваюць у Беларусі. 4. Якія ўмовы спрыяюць развіццю бульбаводства і льнаводства?

***Праблемныя пытанні.*** Што сімвалізуе вянок з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева — кветкамі лёну, на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Пры дапамозе карт атласа (с. 40–45) распрацуйце візітоўку раслінаводства вашай вобласці (раёна). 2. Распрацуйце буклет «Гародніна і садавіна Беларусі».

## § 28. Геаграфія жывёлагадоўлі

***Успомніце.*** *Ці залежыць развіццё жывёлагадоўлі ад прыродных умоў?*

**1. Асаблівасці развіцця жывёлагадоўлі.** Жывёлагадоўля дае самыя высокакаларыйныя прадукты харчавання (мяса, малако, яйкі), пастаўляе воўну, шчаціннe, шкуры, футра для лёгкай прамысловасці і развіваецца ў цеснай узаемасувязі з раслінаводствам. Прыроднай асновай для развіцця жывёлагадоўлі з'яўляюцца лугі. Іх удзельная вага ў плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў па краіне складае 30 %. У межах Палесся доля лугоў вышэйшая, што спрые развядзенню буйной рагатай жывёлы